# ДЗЕНЬ ДОБРЫ, УНІВЕРСІТЭТ!



1 ВЕРАСНЯ. СЕННЯ ГАСЦІННА АДЧЫНІЛІСЯ ДЗВЕРЫ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА. ПАЧАЎСЯ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД...

**Дарагія таварышы! Сардэчна віншуем студэнтаў, аспірантаў, прафесарска-выкладчыцкі састаў, усіх супрацоўнікаў універсітэта з пачаткам новага навучальнага года!**

**Няхай гэты год будзе для вас як ніколі плённым у вучобе, навуковых даследаваннях, у здзяйсненні усіх мар і імкненняў. Ваша праца з'явіцца вялікім укладам у скарбніцу слаўных спраў калектыва універсітэта, які з гонарам нясе перадсвяточную вахту па дастойнай сустрэчы 50-годдзя Савецкай улады.**

*Партком, рэктарат, мясцком, камітэт камсамола, прафком.*


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 24 (676) ● ПЯТНІЦА, 1 верасня 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX


## У ДОБРЫ ЧАС, ПЕРШАКУРСНІК!

ВОСЬ ужо ў сорак шосты раз 1 верасня карпусы універсітэта напаўняюцца вясёлым гоманам моладзі, якая першы, другі... пяты год перастуnае парог буйнейшай у рэспубліцы навучальнай установы.

У сорак шосты раз звініць вераснёўскі званок. Дзве тысячы першакурснікаў сёння ўвайшлі ў шматлікія аўдыторыі. Гэты дзень стаў для іх днём здзяйснення вялікай мары. Яны студэнты.

Паступіць ва універсітэт цяжка. Нездарма ж, як зазначыў сакратар прыёмнай камісіі, з дваццаці тысяч жадаючых паступіць у БДУ, гэтага высокага гонару ўдастоена толькі дзве тысячы. Але паступіць ва універсітэт, гэта не значыць, што пройдзе пяць год і ты атрымаеш дыплом высокакваліфікаванага спецыяліста. Наперадзе ў кожнага з вас напружаная вучоба. Таму з першых дзён трэба настойліва ўзяцца за гэтую цяжкую і адказную працу. Час не чакае. Неўзабаве перад табой, дружа, паўстане першае сур'ёзнае выпрабаванне — сесія. У залікоўцы будзе пастаўлена першая адзнака тваёй працы, а яна ў цябе павінна быць толькі добрай ці выдатнай. Табе пашчаслівілася паступіць у БДУ ў юбілейным годзе. Гэта вялікі гонар і разам з тым вялікі абавязак. Перад усёй краінай, перад універсітэтам.

Універсітэт расце і пашыраецца. Паўсядзённа памнажае славу савецкай навукі. Яго выпускнікі—людзі высокаадукаваныя, выдатныя знаўцы сваёй справы, ідэйна загартаваныя будаўнікі камуністычнага грамадства.

Табе, дружа, памнажаць выдатныя традыцыі студэнтаў і выпускнікоў Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

## МІНСК—ГОРАД СТУДЭНЦКІ

**Першыя замежныя студэнты прыехалі ў Мінск шэсць гадоў назад. Цяпер у Беларускім дзяржаўным універсітэце і шматлікіх інстытутах Мінска навучаецца амаль паўтысячы юнакоў і дзяўчат з 39 краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі.**

**У гэтым годзе адбыўся першы выпуск замежных спецыялістаў. Дыпломы абаранілі 80 чалавек, якія прыбылі ў сталіцу Беларусі з В'етнама, Кубы, з краін Афрыкі і Арабскага Усходу. 14 з закончыўшых Беларускі дзяржаўны універсітэт атрымалі дыпломы выдатнікаў, сталі першакласнымі спецыялістамі. Сярод іх—кубінец Хусто Равело Трыана, в'етнамцы Нгуен Куанг Мінь і Нгуен Чонг Бінь.**

ГАЛОЎНЫ БУДЫНАК УНІВЕРСІТЭТА.





САКРАТАР ПРЫЁМНАЙ КАМІСІІ М. Д. РАМАНКЕВІЧ ПІША ВЫКЛІК НА ЗАНЯТКІ Ў БДУ БУДУЧАМУ ФІЛОСАФУ ТАНІ ЛІФАНАВАЙ.



НЯЎЖО ЗНОЎ НЯЎДАЧА?..



МАЛАДЗЕЦ, СЫНОК! ПАСТУПІЎ...



ЦЯЖКА АДШУКАЦЬ АДНО ПРОЗВІШЧА СЯРОД СОЦЕНЬ...



АЛЕ КАЛІ НЯМА, ДЫК НЕ ЗНОЙДЗЕШ...

Фота В. Паўлава

# ТВАЯ АЛЬМА-МАТЭР

Сорак пяць год існавання нашага універсітэта — гэта напружаны час пошукаў, дзейснай працы і адкрыццяў многіх вучоных старэйшай навучальнай установы Беларусі, гэта час няспыннага росту і імкнення наперад праз навуку ў жыццё многіх тысяч юнакоў і дзяўчат. За гэты тэрмін БДУператварыўся ў буйнейшы навуковы цэнтр падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі, навукова-даследчых устаноў, вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў нашай рэспублікі.

Цяпер ва універсітэце на дзевяці факультэтах навучаецца больш як 16 тысяч студэнтаў, або ў дзесяць разоў больш у параўнанні з годам адкрыцця вну. На кафедрах і ў лабараторыях працуе цяпер каля 900 навукова-педагагічных работнікаў, у тым ліку больш за 370 дактароў і кандыдатаў навук. Выкладанне і выхаванне студэнтаў вядзецца на багатай базе навукова-даследчых лабараторый, шматлікіх кабінетаў, каштоўнага навуковага абсталявання. Універсітэт мае біялагічную і біёлага-геаграфічную вучэбна-навуковыя станцыі, гісторыка-археалагічны, мінералагічны, заалагічны музеі. Не так даўно арганізаваўся нумізматычны кабінет, які налічвае каля засьмі тысяч рэдкіх старажытных манет, што знойдзены на Беларусі.

Універсітэт размешчан у адным з самых вялікіх будынкаў горада. Але, нягледзячы на гэта, прадаўжаецца будаўніцтва новых вучэбных карпусоў. На стадыі завяршэння знаходзіцца хімічны корпус. Ён будзе забяспечаны самым навейшым навуковым абсталяваннем. У яго светлыя і прасторныя аўдыторыі прыйдуць сотні студэнтаў.

Для паспяховага навучання студэнтаў універсітэцкая бібліятэка мае больш паўмільёна кніг па самых розных галінах навукі. У яе прасторных чытальнях кожны дзень настойліва павышаюць свае веды тысячы студэнтаў. Штодня папаўняецца і папаўняецца яе кніжны фонд падручнікамі, манаграфіямі і іншай літаратурай.

Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт рыхтуе не толькі спецыялістаў для народнай гаспадаркі, але і з'яўляецца сапраўднай кузняй навуковых кадраў як для самога універсітэта, так і для іншых навучальных устаноў і навукова-даследчых інстытутаў.

У свой час закончылі філалагічны факультэт нашага універсітэта такія вядомыя дзеячы беларускага народа як Кандрат Крапіва, Пятро Глебка, Пятрусь Броўка, Паўлюк Трус, Іван Мележ.

Пры рэдакцыі газеты «Беларускі універсітэт» працуе літаратурнае аб'яднанне «Узлёт». На яго пасяджэннях студэнты чытаюць свае творы, спрачаюцца, наладжваюць сустрэчы з вядомымі паэтамі і празаікамі. У гэтым годзе на прылаўках магазінаў з'явіцца новы зборнік вершаў, аўтарамі якіх з'яўляюцца члены гэтага аб'яднання.

Студэнты нашага універсітэта не толькі паспяхова авалодваюць ведамі, яны з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі грамадскага жыцця. Вось ужо каторы год запар шматлікія атрады студэнтаў накіроўваюцца ў час летняга адпачынку на цаліну, на будоўлі роднай Беларусі і ў многія іншыя куткі нашай радзімы.

Шмат студэнтаў універсітэта мае магчымасць удзельнічаць у мастацкай самадзейнасці. На раённых, гарадскіх, абласных і рэспубліканскіх конкурсах нашы самадзейныя артысты займаюць першыя месцы. Зараз у нас працуюць сем калектываў мастацкай самадзейнасці, якія налічваюць каля 500 студэнтаў. Гэта Народная харавая капэла, аркестр народных інструментаў, тэатральны, танцавальны калектывы і эстрадна-канцэртныя брыгады.

Ва універсітэце спартыўны клуб і кафедра фізічнага выхавання і спорту вядуць вялікую работу па ўмацаванню здароўя і павышэнню спартыўнага майстэрства студэнтаў. Больш за 2,5 тысячы студэнтаў рэгулярна займаюцца ў спартыўных секцыях па дваццаці чатырох відах спорту. На возеры Нарач для студэнтаў і супрацоўнікаў маецца спартыўна - аздараўленчы лагер. Штогод праводзяцца і міжфакультэцкія традыцыйныя спартакіяды. З гонарам нашы спартсмены выступаюць на рэспубліканскіх і ўсесаюзных студэнцкіх спартыўных гульнях.

Шмат сярод нашых студэнтаў і аматараў турысцкіх паходаў. Існуе цэлая секцыя па альпінізму і турызму, якая наладжвае вучобу з навічкамі, рыхтуецца да зімовых і летніх паходаў па роднай Беларусі, у Карпаты, на Каўказ, Урал, у Карэлію і іншыя раёны нашай краіны.

## Інтэрв'ю ў сакратара прыёмнай камісіі

# НОВАЕ ПАПАЎНЕННЕ

Перад дзвярыма 475-й аўдыторыі фізічнага корпуса, якая часова абсталявана пад кабінет адказнага сакратара універсітэцкай прыёмнай камісіі, хвалюецца доўгая чарга абітурыентаў. Экзамены здадзены, набрана адпаведная колькасць балаў, але пытанне «студэнт ці не?» пакуль што так і застаецца пытаннем. Можа на яго адкажа сакратар прыёмнай камісіі? Спісы ж, кажуць, ужо ёсць...

Так, ёсць. Вось яны перада мной, на стале дэкана фізічнага факультэта Івана Паўлавіча Зяцькова, сёлетняга адказнага сакратара прыёмнай камісіі БДУ. Зараз іх панясуць на зацвярджэнне рэктару і толькі пасля гэтага вывесяць ва універсітэцкім вестыбюлі. І будзе бурліць, хваляваціца вакол іх неспакойны абітурыенцкі натоўп, і будуць усмешкі, а, магчыма, і слёзы... А для шчаслівчыкаў яны стануць мандатам на права заняць месца ў аўдыторыі «вну № 1» рэспублікі —універсітэта імя У. І. Леніна.

**З гэтага і пачынаецца размова з адказным сакратаром прыёмнай камісіі БДУ І. П. Зяцьковым.**

На першы курс дзённага, вячэрняга і завочнага аддзяленняў залічана амаль тры з палавінай тысячы чалавек, якія будуць авалодваць 15 рознымі спецыяльнасцямі на 9 факультэтах. Адзін з іх новы — факультэт журналістыкі.

— **Якія адметныя рысы сёлетняга прыёму?**

— Самая адметная, бадай, тая, што гэта прыём юбілейнага года. І, трэба сказаць, новае папаўненне калектыву Беларускага універсітэта аказалася вартым слаўнай даты, якая знамянуе пачатак студэнцкай біяграфіі кожнага з нашых сёлетніх навічкоў.

Дастаткова сказаць, што каля дзевяцісот чалавек — больш чым палавіна залічаных на першы курс — медалісты; імі амаль поўнасцю ўкамплектаваны некаторыя факультэты, як, напрыклад, хімічны. І, што асабліва прыемна, веды медалістаў, за выключэннем літаральна адзінак, сапраўды адпавядаюць іх атэстатам. Шмат абітурыентаў набрала абсалютную колькасць балаў, атрымаўшы на экзаменах усе «пяцёркі». На фізічным факультэце, напрыклад, такіх 113 чалавек з 275 залічаных на першы курс.

— **Як размеркаваліся месцы паміж абітурыентамі з вытворчым стажам і школьнікамі?**

— Дакладных лічбаў яшчэ няма, але на большасці факультэтаў гэта прапорцыя ў карысць апошніх. Толькі на некаторых факультэтах, як, напрыклад, на юрыдычным, школьнікі засталіся ў меншасці. Але, на мой погляд, больш паказальная не ўзроставая, а сацыяльная структура новага набору. У мінулым прыток гараджан звычайна пераважаў над колькасцю сельскіх абітурыентаў. Сёлета малюнак змяніўся: большасць юнакоў і дзяўчат, якія сталі студэнтамі, — вясковая моладзь.

— **Ці заўважылі вы пэўную заканамернасць у якасці ведаў выпускнікоў розных школ?**

— Вядома. Нельга было не заўважыць добрай падрыхтоўкі рэчыцкіх школьнікаў, якія выдатна здавалі экзамены на ўсе факультэты, а таксама выпускнікоў Гарадзейскай фізічна-матэматычнай школы-інтэрната. Бярозаўскай і Клецкай сярэдніх школ і многіх іншых. Я ўжо не кажу пра 50-ю ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга сярэднюю школу г. Мінска, якую іншы раз жартам называюць фізіка-матэматычным філіялам універсітэта, а таксама пра 2-ю, 4-ю, 6-ю, 19-ю і 42-ю мінскія школы, чые выпускнікі паказалі добрыя веды на ўступных экзаменах у БДУ.

— **Мяркуючы па лічбах уступнага конкурсу, які факультэт аказаўся самым папулярным?**

— Бадай, фізічны. На аддзяленне радыёфізікі паступала два медалісты на месца. Наогул вялікім попытам, калі можна так сказаць, карыстаюцца ў моладзі дакладныя і прыродазнаўчыя навукі: матэматыка, хімія, біялогія.

— **Ці не маглі б вы паведаміць у заключэнне неафіцыяльную, жартоўную статыстыку абітурыенцкай сесіі?**

— Якую? (На твары майго субяседніка здзіўленне, якое неўзабаве усё ж змяняецца ўсмешкай). Ну вось, калі ласка, хаця б такія «несур'ёзныя» лічбы. Усяго за час прыёмных экзаменаў было выстаўлена 19.150 адзнак. Сярод іх больш за ўсё «чацвёрак» — 7.684. На другім месцы здавальняючая адзнака — 5.296, потым ідзе вышэйшы бал — «пяцёрак» на экзаменах было атрымана 4.503. І, нарэшце, «двойка» займае самае апошняе месца. Яна выстаўлялася ў экзаменацыйных ведамасцях «усяго» 1.667 разоў.

Мой субяседнік спяшаецца: трэба апошні раз удакладніць спісы перад тым, як яны будуць вывешаны ва універсітэцкім вестыбюлі. Гэта падзея запомніцца, бадай, на ўсё жыццё кожнаму з тых, чыё прозвішча з'явілася ў студэнцкіх спісах у адзін з апошніх жнівеньскіх дзён такога незвычайнага года.

Інтэрв'ю запісаў
**А. КАРЭЛІН.**

# ПА ТРАДЫЦЫІ

Здаўна ў нашым універсітэце існуе выдатная традыцыя перад пачаткам навучальнага года арганізоўваць сустрэчы першакурснікаў з прафесарска-выкладчыцкім калектывам, са студэнтамі старэйшых курсаў... Такія ўрачыстасці застаюцца ў сэрцы першакурсніка на ўсё жыццё. Учора, 31 жніўня, дэканы, сакратары партыйных і камсамольскіх арганізацый факультэтаў шчыра і сардэчна павіншавалі моладзь з паступленнем ва універсітэт, заклікалі свята захоўваць гонар навучальнай установы, якая носіць імя Вялікага Леніна і ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, старанна і настойліва авалодваць ведамі, памнажаць слаўныя традыцыі універсітэцкай камсамоліі.

Тут жа, на гэтых сустрэчах, адбыліся першыя знаёмствы першакурснікаў са старэйшымі сябрамі-студэнтамі, прафесарамі і выкладчыкамі. Завязваецца цеснае таварыства, якое патрэбна мацаваць з кожным днём, з кожнай гадзінай: яно здольна пранесці студэнта на працягу ўсяго часу навучання ў Беларускім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна.

# МЫ З ТАБОЙ, ГЕРАІЧНЫ В'ЕТНАМ!

*Заўтра 22 гадавіна ДРВ*

2 верасня 1945 года на гістарычнай плошчы Ба-дзінь прэзідэнт Хо Шы Мін перад усім светам абвясціў аб незалежнасці В'етнама. Была створана Дэмакратычная Рэспубліка В'етнам — краіна народнай дэмакратыі, якая паставіла сваёй мэтай завяршэнне нацыянальна - дэмакратычнай рэвалюцыі і пераход па марксісцка-ленінскім шляху да сацыялістычнай рэвалюцыі.

Але неўзабаве мірная стваральная праца в'етнамскага народа была парушана агрэсіяй амерыканскіх імперыялістаў. Мужнай сцяной узняліся людзі гэтага краю на справядлівую барацьбу за незалежнасць сваёй краіны.

Савецкія людзі ўважліва сочаць за жыццём і змаганнем гераічнага В'етнама. Ні бомбы, ні напалм, ні нарастаючая эскалацыя не зламае волі і прагі да свабоды в'етнамскіх людзей.

Наша краіна аказвае паўсядзённую дапамогу ДРВ. Дзесяткі і сотні тысяч в'етнамскіх студэнтаў навучаюцца ў вну і тэхнікумах Савецкага Саюза. Моладзь В'етнама жыве побач з рускімі, украінцамі, беларусамі, сярод юнакоў і дзяўчат іншых народаў краіны. Цеснае сяброўства, адзінства мэты, прага да міру і свабоды аб'ядноўваюць іх, як родных братоў і сясцёр. Савецкія студэнты заўсёды прыходзяць на дапамогу в'етнамскім сябрам; а вядома, што, калі поруч адчуваецца падтрымка, любая цяжкасць пераадольваецца.

Сваё вялікае свята студэнты з гераічнага В'етнама сустракаюць у нашым Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна шосты раз. Толькі ў мінулым годзе падрыхтоўчы факультэт БДУ закончыла 109 студэнтаў з В'етнама. У гэтым годзе да нас прыехала на вучобу каля 150 юнакоў і дзяўчат з ДРВ. Пройдуць гады, яны вернуцца на сваю Радзіму і добрым словам успомняць універсітэт, выкладчыкаў, студэнтаў, дзе яны атрымалі вышэйшую адукацыю. Выпускнік БДУ До Ван Мао, які зараз працуе ў Ханоі, нядаўна прыслаў ліст, у якім ад усяго сэрца дзякуе прафесарска - выкладчыцкі састаў, камсамольцаў, усіх студэнтаў за тыя шчырыя, бацькоўскія клопаты, якія праяўлялі яны дзеля яго будучага.

Адзіным імкненнем жывуць народы Савецкага Саюза і Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Мы цвёрда ўпэўнены, што народ В'етнама пераможа, хутка прыдзе час, калі светла заззяе сонца і ў блакіце в'етнамскага неба не будзе ніводнага амерыканскага самалёта, а на зямлі не застанецца ніводнага акупанта.

Сёння мы горача віншуем в'етнамскіх студэнтаў з вялікім святам.

В. ІСКРЫК.

# СТАЛІЦА СУСТРАКАЕ РАМАНТЫКАЎ

*Бадай, даўно не было так мнагалюдна на пероне Мінскага вакзала. Вестка аб прыездзе цаліннікаў маланкава пранеслася па сталіцы. Студэнты, моладзь, грамадскасць Мінска з кветкамі прышлі сустракаць пасланцоў камсамола Беларусі, які свае працоўныя справы прысвяціў 50-годдзю Савецкай улады. А поспехі ў іх у гэтым годзе выдатныя...*

*Праходзяць хвалюючыя мінуты чакання... Нейкі ўсеагульны ўздым радасці выклікае паяўленне цягніка, усе цягнуцца да загарэлых, абветраных казахскім ветрам твараў юнакоў і дзяўчат. Звісаюць з вакон чырвоныя сцягі, якімі ўзнагароджаны студэнты за выдатную працу.*

*Абдымкі, пацалункі, гарачыя поціскі рук, віншаванні...*

*Але неўзабаве гоман сціхае. Начальнік эшалона студэнт нашага універсітэта Анатоль Ярохін падае каманду станавіцца ў шарэнгу. Пасля Анатоль маладцаватым крокам падыходзіць да загадчыка аддзелам студэнцкай моладзі ЦК ЛКСМБ Ніны Нерад і дакладвае аб прыбыцці байцоў працоўнага семестра. У яго словах адчуваецца гонар і радасць за тое, што студэнты Беларусі і ў гэтым годзе пачэсна выканалі абавязкі, якія ўсклала на іх Радзіма. Пабудаваны сотні жыллёвых дамоў, вытворчых аб'ектаў. Цяпер, калі тут, на вакзале, адбываецца ўрачыстасць, то там, на пабудаваных імі вуліцах, спраўляюць наваселле сотні жыхароў. І, відаць, першы тост падымаюць яны за тых, хто пад пякучым сонцам пабудаваў такія ўтульныя дамы...*

*Ніна Нерад звяртаецца да цаліннікаў з кароткай прывітальнай прамовай.*

*А. СЯРДЗЮК.*



## Маладыя цаліны

НАД пасёлкам цішыня. Сонца толькі што паднялося над шызым дрыготкім гарызонтам і велізарнай вогненнай рыбінай пляскоча ў хвалях Кушума. Лёгкі вецер гоніць па стэпе перакаці-поле, а то раптам закруціцца, як уюн, на адным месцы, і ўжо глядзіш на слуп пылу, які падымаецца высока-высока ў сінеч неба і трасе сваёй калматай грывай. Паветра яшчэ не астыла ад учарашняй спёкі, а сонца выпускае зноў са свайго калчана промні—стрэлы. Куды ні глянь, з усіх чатырох бакоў міражы. Вось, здаецца, ляціць стрымгалоў з-пад Пяцімара лавіна коннікаў, а то раптам заўважаеш далёка на самай лініі гарызонта, там, дзе неба зліваецца з шэрым стэпам, прыгожы белакаменны палац. Але колькі ні ідзі — да яго дарога бясконцая.

Паціху перабіраючы лапкамі, у вярблюжатніку снуюць суслікі. Ледзь прыкметнай кропкай у вышыні кружыць стэпавы арол і, нібы хмаркі, паволі плывуць атары да ракі.

Першымі прачынаюцца ў пасёлку повары Оля Гаращук і Ала Мазгавая. Праз некалькі хвілін дыміць кухня, рыхтуецца снеданне. Роўна ў сем гадзін са свайго «кубрыка» выходзіць гарніст Валерый Дубоўскі. З першымі гукамі трубы лагер ажывае. Хлопцы і дзяўчаты выстройваюцца ў дзве шарэнгі каля сцяга. Камандзір Алег Слука ўрачыста камандуе: «Раўненне на сцяг. Баец Аскірка! Сцяг падняць!»

Гэтага права ўдастойваецца лепшы баец атрада, які вызначыўся ў працы ва ўчарашні дзень.

Паволі плыве ўгору сцяг далёкай Беларусі. Моўчкі глядзяць на яго рабяты, успамінаючы родны Мінск, сяброў і родных. Але ўрачыстая хвіліна праходзіць, і адразу пачынаецца разнарадка на работу, таму што пасля снедання роўна ў 8 гадзін усе павінны быць на сваіх аб'ектах. Дысцыпліна ў атрадзе жалезная, без яе нельга.

Пакуль хлопцы разыходзяцца па аб'ектах, я пазнаёмлю вас з нашым пасёлкам і членамі атрада «Зубронак», студэнтамі БДУ.

Невялікая шыльда ў пачатку вуліцы. На ёй напісана: «Пасёлак Юбілейны». Гэта і ёсць наш пасёлак. Пакуль што ў большасці каробкі выведзеных трох- і двухкватэрных дамоў, магазіна. Чатыры дамы ўжо радуюць прыгожымі шыфернымі дахамі. Дахі зараз — ударны фронт на будоўлі. Тут працуе брыгада Віктара Данілкіна. Апошнія цагліны ў каробкі дамоў кладуць Барыс Плотнікаў. Толя Казловіч, Коля Барысенка, Толя Тарасевіч. Ударная дзесяцідзёнка, якая праходзіла ў нас з 21 ліпеня, паказала, што байцы атрада працуюць па-сапраўднаму. За гэты тэрмін пад умелымі рукамі Лёні Бохана і Івана Русакевіча непадалёку ад пасёлка ўзняліся кашара і кароўнік. А на нашай, адзінай у пасёлку вуліцы, выраслі яшчэ два дамы. Добра папрацавалі нашы саманшчыкі Іван Аскірка, Мікалай Макарэвіч, Іван Клімянкоў, Пётр Голубеў, Васіль Гурын, Рыгор Лісаў, Віктар Рахінскі і іншыя. Імі нарыхтавана 120 тысяч цаглін. На абмазцы працуюць брыгады Фёдара Кулакова, камісара атрада, і Івана Мацкевіча. Яны выконваюць штодзённа па дзве нормы.

Хаця пасля работы свабоднага часу вельмі мала, атрад удзельнічае і ў культурным жыцці саўгаса «Красногорскі». Нашы самадзейныя артысты выступалі з двума канцэртамі перад чабанамі, механізатарамі і жывёлаводамі на цэнтральнай сядзібе саўгаса.

У атрадзе рэгулярна выпускаецца газета «Зара ў стэпе» і яе сатырычны дадатак «Самантайлес».

З першых дзён работы беларускія студэнты завязалі цесную дружбу з будаўнічым атрадам Уральскага педінстытута «Праметэй». Вельмі цікава прайшоў вечар дружбы беларускай і казахскай моладзі, які адбыўся 1 жніўня ў Дзень студэнта-будаўніка. Адбыліся таварыскія спартыўныя гульні, а вечарам ішоў аб'яднаны канцэрт. Са сцэны клуба гучалі казахскія песні і музыка, іх змянілі вясёлыя песні і вершы беларусаў. У заключэнне аб'яднаны хор студэнтаў-будаўнікоў праспяваў песню «Хлапчукі».

У дзевяць гадзін вечара заканчваецца работа. Пасля вячэры на беразе Кушума ўспыхвае вялікі касцёр. Высока ў яснае зорнае неба ляцяць іскры-светлячкі. Полымя асвятляе загарэлыя твары, мазолістыя рукі хлопцаў. Атрадны музыкант Гена Стрыжэвіч разгарнуў мяхі баяна. Над прыціхлай ракой праплываюць песні аб Беларусі і песні. якія нарадзіла блакітная планета. Пройдзе некалькі дзён, і гэтыя песні будуць спяваць гудкамі эшалоны пад Мінскам. А пакуль што набліжаецца раніца — раніца новага рабочага цаліннага дня.

**Сяргей ЗАКОННІКАЎ.**
Уральская вобласць,
Чапаеўскі раён,
пас. Юбілейны.

# ВАС ЗАПРАШАЕ БІБЛІЯТЭКА

**І. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ**

**Запіс чытачоў праводзіцца пры прад'яўленні пашпарта і студэнцкага білета, службовага пасведчання, на падставе якіх бібліятэка выдае пастаянны адзіны білет чытача. Бібліятэка штогод праводзіць перарэгістрацыю чытачоў. Пры перарэгістрацыі чытач павінен здаць для ўліку літаратуру, якая лічыцца за ім, якую ён зможа атрымаць зноў пасля перарэгістрацыі. Чытачы, якія не прайшлі перарэгістрацыі, бібліятэкай не абслугоўваюцца.**

**Студэнты і аспіранты перад летнімі канікуламі павінны здаць усе кнігі, якія лічацца за імі.**

**Аб змяненні месца работы, вучобы або адраса чытач павінен паведаміць у бібліятэку ў 10-дзённы тэрмін.**

**ІІ. ПАРАДАК КАРЫСТАННЯ ЛІТАРАТУРАЙ**

**а) ПА АБАНЕМЕНЦЕ.**

**Навуковая літаратура выдаецца чытачам на тэрмін да двух месяцаў.**

**Тэрмін карыстання кнігай можа быць прадоўжаны пры ўзгадненні з работнікамі абанемента.**

**Для студэнтаў-завочнікаў тэрміны карыстання падручнікамі ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад тэрмінаў правядзення лабараторна-экзаменацыйных сесій.**

**Не выдаюцца на дом рэдкія і каштоўныя выданні, дысертацыі, аўтарэфераты, рэфератыўныя часопісы, газеты, а таксама кнігі, атрыманыя па міжбібліятэчнаму абанементу.**

**У выпадку затрымкі кніг звыш устаноўленага тэрміну без уважлівых прычын чытач пазбаўляецца права карыстання бібліятэкай на 1—2 месяцы.**

**Па міжбібліятэчнаму абанементу літаратура выдаецца абанементам на адзін месяц.**

**б) У ЧЫТАЛЬНЫХ ЗАЛАХ.**

**Кнігі з дапаможных фондаў чытальных залаў кнігасховішчаў выдаюцца па вуснаму патрабаванню або патрабавальных лістках.**

**Выносіць кнігі з чытальнай залы не дазваляецца. Выходзячы з чытальнай залы на працяглы час, чытач павінен здаць кнігі дзяжурнаму бібліятэкару.**

## НАРОДЖАНЫ РЭВАЛЮЦЫЯЙ



**30 КАСТРЫЧНІКА** 1921 года адбылося ўрачыстае адкрыццё першай вышэйшай школы Савецкай Беларусі — Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Упершыню рэгулярныя заняткі ва універсітэце пачаліся з 1 лістапада таго ж года.

**ІМЯ У. І. ЛЕНІНА** прысвоілі БДУ у 1949 годзе, у дзень вялікага нацыянальнага свята беларускага народа — 30-й гадавіны ўтварэння Савецкай Беларусі.

**У АСАБІСТАЙ** бібліятэцы У. І. Леніна ў Крамлі захоўваецца больш дзесятка кніг, якія напісаны вучонымі нашага універсітэта. Сярод іх — «Нарысы беларускай літаратуры» прафесара М. А. Янчука, кнігі У. І. Пічэты і М. М. Нікольскага.

**ПЕРШЫМ** рэктарам універсітэта быў вядомы вучоны — прафесар Уладзімір Іванавіч Пічэта (1878-1947). Ён чытаў лекцыі па гісторыі народнай гаспадаркі Расіі і Беларусі, напісаў шмат буйных навуковых прац па гісторыі Беларусі, Літвы і Украіны.

**НА ПЕРШЫ** курс трох факультэтаў універсітэта (рабочага, грамадскіх навук і медыцынскага) было прынята 1390 чалавек. Большасць студэнтаў былі дзеці рабочых і сялян.

**ВЯЛІКУЮ** педагагічную і навуковую работу на кафедры беларускай мовы універсітэта вёў народны паэт Беларусі Якуб Колас.

**СЯРОД** першых чатырнаццаці прафесараў універсітэта былі В. М. Доўнар-Запольскі (гісторыя Беларусі), В. Н. Перцаў (гісторыя сярэдніх вякоў), Е. Е. Сіроцін (фізіка), Б. Я. Эльберт (мікрабіялогія), Н. А. Янчук (беларуская літаратура) і іншыя. У 1927 годзе ва універсітэце працавала 49 прафесараў, 51 дацэнт, 74 асістэнты, 39 ардынатараў. Колькасць студэнтаў на той жа год склала ўжо 2.672.

**У 1925** годзе наш універсітэт даў народнай гаспадарцы рэспублікі першых выпускнікоў — 119 эканамістаў і 117 юрыстаў.

**АСПІРАНТУРА** пры універсітэце была адкрыта ў 1927 годзе. Да сягоднящняга дня яна паспяхова вырашае задачу па падрыхтоўцы навуковых і выкладчыцкіх кадраў.

**НА БАЗЕ** Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў пачатку 30-х гадах выдаваўся часопіс «Шлях студэнцтва» — орган прафсаюзнай арганізацыі, дзе друкаваліся вершы і апавяданні студэнтаў, асвятлялася дзейнасць навуковых студэнцкіх гурткоў, друкаваўся дыскусійны матэрыял.

# Здымаюць фотааматары



Фотаздымкі студэнта фізфака ПАПОВА

◆ Калектыў самадзейных артыстаў БДУ быў адзін з самых вялікіх у Тарту, дзе гэтым летам праводзілася Свята Песні. У сваім складзе ён налічваў каля 220 чалавек. Ганаровыя граматы, каштоўныя падарункі і віншаванні — сведка высокага мастацкага выканання нашымі студэнтамі праграмных нумароў.

◆ 300 студэнтаў універсітэта цудоўна правялі лета ў піянерскіх лагерах, дзе яны спалучалі адпачынак з педагагічнай практыкай.

◆ 4.000—лічба ўнушальная. Гэта колькасць студэнтаў нашага універсітэта, якая ўдзельнічала ў трэцім працоўным семестры.

## ХРОНІКА. ПАДЗЕІ. ФАКТЫ.

◆ На нівах і будоўлях Польшчы, Чэхаславакіі, ГДР працавала 40 студэнтаў БДУ.

◆ У раёнах і гарадскіх пасёлках рэспублікі працавала 1.050 выхаванцаў універсітэта. Імі пабудаваны дзесяткі жылых дамоў, школ, клубаў, лазняў, кароўнікаў.

◆ Многа студэнцкіх будаўнікоў універсітэта працавала на Ангары, у Краснаярску, Крыме, у калгасах і саўгасах Уральскай вобласці.

◆ Добра зарэкамендаваў сябе атрад студэнтаў, які ўдзельнічаў у будаўніцтве піянерскага лагера «Зубронак».

# «ДРУЖБУ» СУСТРАКАЕ ДРУЖБА

КАЛІ сёлета стала вядома, што аўтапоезд «Дружба» накіроўваецца па маршруту Мінск—Наваполацк — Полацк — Віцебск — Орша — Горкі — Магілёў — Гомель — Светлагорск — Бабруйск — Любань — Мінск, многія савецкія і замежныя студэнты беларускіх вну выказалі жаданне выехаць у падарожжа ў другі і нават трэці раз. Напрыклад, з першым аўтапоездам «Дружба» ў 1965 годзе выязджаў выпускнік падрыхтоўчага факультэта БДУ імя У. І. Леніна кубінец Луіс Эрнандэс. І хоць ён цяпер вучыцца ў Кіеўскім палітэхнікуме сувязі, аднак у другі раз са сваімі старымі сябрамі і новымі знаёмымі прымае ўдзел у цікавым падарожжы.

Пасажыры «Дружбы»— 150 турыстаў, у тым ліку 114 замежных студэнтаў з 11 краін: ДРВ, Кубы, МНР, Сірыйскай Арабскай Рэспублікі, Судана, Бурундзі, Кеніі, Конга (Бразавіль), Тога, С'ера-Леоне і Радэзіі.

Сем аўтобусаў, упрыгожаных лозунгамі, нацыянальнымі сцяжкамі і кветкамі, імчаць па турысцкай трасе, спяшаючца ад горада да горада, ад сяла да сяла. Бо дзесяць дзён для такога маршруту зусім нямнога. А пасажыры на рэдкасць дапытлівыя.

ПЕРШЫ прыпынак зроблен у Наваполацку, што вырас побач са старажытным, авеяным легендамі Полацкам.

Вялікае ўражанне зрабілі на савецкіх і замежных студэнтаў узведзеныя гмахі хімічнага камбіната, які хутка ўвойдзе ў строй. Асабліва радуюцца новабудоўлям будучыя хімікі-студэнткі універсітэта Святлана Осіпава і Ларыса Саульская. Хто ведае, можа каму з іх давядзецца тут працаваць...

Непаўторнай дэманстрацыяй сімпатый і пачуццяў дружбы да юнакоў і дзяўчат розных краін і кантынентаў з'явіўся вечар у гарадскім Зялёным тэатры. Кветкі, усмешкі былі гаспадарамі на гэтым вечары.

В'етнамскі студэнт Ву Нгок Ан у сваім выступленні горача дзякаваў усяму савецкаму народу за брацкую дапамогу, якую ён аказвае в'етнамскаму народу ў барацьбе супраць амерыканскіх агрэсараў і іх сатэлітаў. Сірыйскі студэнт Беларускага політэхнічнага інстытута Мааруф Аднан у сваім выступленні падкрэсліў той факт, што толькі дзякуючы намаганням і цвёрдай падтрымцы арабскіх народаў з боку сацыялістычных краін і ў першую чаргу з боку Савецкага Саюза ізраільскія агрэсары спынілі ваенныя дзеянні супраць арабскіх краін на Бліжнім Усходзе. На вечары выступілі таксама кубінец Луіс Эрнандэс і студэнт з С'ера-Леоне Джон Тамба. Яны горача віталі навапалачан, выказваючы словы падзякі за цёплую сустрэчу, гасцінны прыём.

НА другі дзень аўтапоезд «Дружба» прыбыў у Полацк, што размясціўся на маляўнічых берагах Заходняй Дзвіны. На подступах да горада «Дружба» была сустрэта чырванагальштучнай піянерыяй. Да падножжа Кургана Бяссмяротнасці, дзе запалены Вечны агонь, савецкія і замежныя студэнты ўсклалі вянкі і жывыя кветкі. Тут адбыўся мітынг, які адкрыў сакратар Полацкага гаркома ЛКСМБ А. Івашчанка. На мітынгу з прывітальным словам да гасцей звярнуліся ганаровы грамадзянін горада, член партыі з 1917 года Н. Ш. Сімаоўскі, рабочы мэблевай фабрыкі, сакратар камсамольскай арганізацыі Галіна Палій. Са словам у адказ ад імя «дружбаўцаў» выступіў в'етнамец Ву Нгок Ан.

Затым госці азнаёміліся з выдатнымі мясцінамі старажытнага беларускага горада, які ўпершыню ўпамінаецца ў летапісе ў 862 годзе. Госці наведалі закладзены моладдзю горада парк імя 50-годдзя Савецкай улады.

«Дружба» імчыцць у новыя далі. Вось і Віцебск—буйны прамысловы горад рэспублікі. Тут студэнты наведалі дывановы камбінат, швейную фабрыку «Шлях індустрыялізацыі», краязнаўчы музей.

Тры дні, праведзеныя ў Віцебску, надоўга запомняцца кожнаму з пасажыраў «Дружбы». Юныя ленінцы запрасілі студэнтаў да сябе ў госці, у піянерскі лагер. Тут адбыўся футбольны матч паміж зборнай інтэрнацыянальнай «Дружбы» і піянерскай зборнай. Выйгралі госці з лікам 1:0. Затое зборнай маладзёжнай Віцебска яны прайгралі з лікам 6:2.

У Палацы культуры работнікаў бытавога абслугоўвання адбыўся вечар інтэрнацыянальнай дружбы. На вечары аб сваіх краінах расказалі віцяблянам в'етнамец Ву Нгок Ан, кубінец Луіс Эрнандэс, суданскі студэнт, старшыня савета клуба інтэрнацыянальнай дружбы БПІ Эль Амін Осман Бабікер Махамед.

ЗАСТАЛАСЯ ззаду Заходняя Дзвіна. Нас вітае сівы Днепр. Мы у Оршы, якой нядаўна споўнілася 900 гадоў. Тут, ля Кургана Бессмяротнасці савецкія і замежныя студэнты сустрэліся з Героем Савецкага Саюза Аляксандрам Васільевічам Івановым, які ўдзельнічаў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі пад Смаленскам, вызваляў Магілёў. Шмат цікавага расказаў ён дарагім гасцям.

Ля падножжа Кургана Бесмяротнасці турысты ўсклалі вянок з жывых кветак.

Затым яны наведалі музей Канстанціна Заслонава і ўсклалі вянок да помніка герою-партызану. Гасцей суправаджаў дырэктар музея К. Заслонава Герой Савецкага Саюза М. Д. Сіянін.

У атмасферы дружбы і таварыскасці прайшоў вечар інтэрнацыянальнай дружбы ў горадзе Горкі, дзе госці выступілі з вялікім канцэртам.

Вечар інтэрнацыянальнай дружбы адбыўся і ў Магілёўскім машынабудаўнічым тэхнікуме. На ім са словамі падзякі да ўсіх прысутных звярнуўся студэнт БПІ Джон Джуніса.

Пабывалі турысты і ў адным з самых маладых гарадоў рэспублікі — Светлагорску. Тут яны наведалі завод штучнага валакна.

А ўвечары з кветкамі і песнямі, з усмешкамі на тварах турыстаў сустракалі бабруйчане. Тут адбыўся мітынг дружбы.

Назаўтра госці, азнаёміўшыся з выдатнымі мясцінамі Бабруйска, выехалі ў Любанскі раён, на Міншчыну.

А ВОСЬ і востраў Зыслаў. Да помніка героям, загінуўшым у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, студэнты ўсклалі вянок. Да гэтых часоў тут захаваліся партызанскія зямлянкі. У гады вайны тут размяшчаўся Мінскі падпольны абком партыі, Любанскі падпольны райком партыі, дыслакаваўся штаб 25-й партызанскай брыгады. Рукамі партызан быў пабудаваны вялікі аэрадром, што прымаў тут самалёты з Вялікай зямлі, якія дастаўлялі партызанам зброю, боепрыпасы, медыкаменты, газеты і г. д.

Аб усім гэтым нам расказаў былы партызан разведчык Аляксандр Карлавіч Кіндэрскі, які працуе зараз дырэктарам саўгаса «Загальскі», што на Любаншчыне.

На мітынгу на востраве Зыслаў выступілі в'етнамец Фам Зыонг, сірыец Мааруф Аднан і студэнт з Тога Буконда Дау Люсьен.

Ноччу поезд «Дружба» вярнуўся ў Мінск.

Аўтапоезд «Дружба» расфарміроўваецца толькі да наступнага лета. А потым— новыя кіламетры, новыя сардэчныя сустрэчы.

У. ГАЛАЙША.

Выдатна адпачывалі на возеры Нарач замежныя студэнты.



У ГЭТЫМ ГОДЗЕ НАША РЭСПУБЛІКАНСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА «ЗНАМЯ ЮНОСТИ» ПРАВОДЗІЛА ФОТАКОНКУРС «ПАТРЫЁТ». У РЭДАКЦЫЮ ДАСЫЛАЛІСЯ ЛЕПШЫЯ ЗДЫМКІ, ЗРОБЛЕНЫЯ НА МЕСЦАХ БАЯВОЙ І РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ СЛАВЫ. РАДАСНА АДЗНАЧЫЦЬ, ШТО ПЕРАМОЖЦАМ ГЭТАГА КОНКУРСУ БЫЎ АБ'ЯЎЛЕН СТУДЭНТ НАШАГА УНІВЕРСІТЭТА, ФОТАКАРЭСПАНДЭНТ ГАЗЕТЫ «БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ» Г. КАДЗЕТ. ВІНШУЕМ ЯГО І ЖАДАЕМ НОВЫХ ПОСПЕХАЎ.

Зак. 1369. АТ 13606. Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, П. 106. тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Нам. рэдактара П. ТКАЧОЎ.